ЗАВАРОЖАНЫ РОДНЫМ

Калі мне ўпершыню давялося ў 1988 годзе пабываць на Гродзеншчыне, сябры з „Паходні" палічылі абавязкам паказаць мне Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей і пазнаёміць з яго заснавальнікам. Ад першай сустрэчы з Алесем Белакозам мне стала вядома, што маю дачыненне з энтузіястам, чалавекам, заварожаным сваёй зямлёй і яе мінулым. Нядаўняя другая сустрэча пацвердзіла толькі маё перакананне і папоўніла вобраз гэтага сапраўднага патрыёта, змагара за нацыянальнае адраджэнне беларускага народа.

Алесь Белакоз ад 1943 года працуе ў Гудзевічах выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў мясцовай школе. З любові да роднага ўзнікла ў яго ў палове шасцідзесятых гадоў задума стварыць супольна з вучнямі музей. Пачалі збіраць краязнаўчыя матэрыялы, наладзілі сувязь з літаратарамі і вучонымі з розных цэнтраў Савецкага Саюза і з-за мяжы. Пачатак быў вельмі скромненькі — для сабраных экспанатаў быў адведзены невялічкі пакойчык у школе. Ідэю Алеся Белакоза падтрымаў старшыня мясцовага калгаса Міхась Пронька. Дзякуючы яму, на патрэбы музея была куплена і перавезена сялянская хата з XIX стагоддзя (там зараз этнаграфічны музей), быў адрамантаваны і прыстасаваны будынак старой школы, калі тая атрымала новае памяшканне.

Зараз у музеі звыш 6 тысяч экспанатаў. У зале, прысвечанай беларускай літаратуры, шмат цікавых і каштоўных рэчаў. Значнае месца займаюць рэдкія выданні беларускіх кніг і часопісаў, а сярод іх „Лемантар" Алесі Смоліч, „Заранка", рэдагаваная Зоськай Верас, ці штомесячнік „Беларуская борць". На стэндах многа здымкаў літаратараў і мастакоў, іх лістоў і твораў з аўтографамі. Усё гэта сабрана ў выніку перапіскі вучняў Гудзевіцкай школы з беларускімі літаратарамі. Сярод экспапатаў можна заўважыць ручку, якой Уладзімір Караткевіч напісаў „Каласы пад сярпом тваім", аўтографы касма-

наўтаў-землякоў Пятра Клімука і Уладзіміра Каваёлнка, зборнікі і рукапісы Ларысы Геніюш, якая вучылася ў Гудзевіцкай школе. Сустракаю і беластоцкія акцэнты: „Ніву" з артыкулам пра Міхася Арла, ліст Юрыя Туронка, кніжку Сакрата Яновіча „Сярэбраны яздок" з аўтографам аўтара, „Беларускі каляндар", выдадзены Галоўным праўленнем БГКТ.

У другой зале шырока прадстаўлена народная творчасць. Тут можна пазнаёміцца з многімі прадметамі — ад найдаўнейшых, зробленых далёкімі продкамі ў каменны век, да больш ужо сучасных вырабаў рамеснікаў з XIX і XX стагоддзяў. Творы народных умельцаў сабраны ў тэматычныя групы: кавальства, апрацоўка лёну, вышыўка і ткацтва, вырабы з дрэва, саломкі і лазы, ганчарства. Прыцягвае зрок жаночая і мужчынская народная вопратка жыхароў Гудзевіч з трыццатых гадоў нашага стагоддзя. Вялікай рэдкасцю з'яўляецца глобус з Віленскай беларускай гімназіі: на ім геаграфічныя назвы па-беларуску.

У музеі ёсць асобная зала з творамі выяўленчага мастацтва на літаратурныя і гістарычныя тэмы. Сярод ахвярадаўцаў сустракаем прозвішчы Міколы Купавы, Арлена Кашкурэвіча, Аляксея Марачкіна, Алеся Ліпеня і іншых.

Зусім нядаўна створаны музей народнай медыцыны. У ім сабраны розныя віды зёлак, апісаны лекавыя асаблівасці кожнай зёлкі, скамплектавана багатая літаратура. Алесь Белакоз з'яўляецца гарачым прыхільнікам лячэння крамянёвай вадой. Крэмень змяшчае ў сабе многія мінеральныя рэчывы, якія дапамагаюць хвораму арганізму змагацца з хваробамі. Дзеянне крамянёвай вады праверыў ён на сабе і таму такі від лячэння прапануе наведвальнікам. А крамянёвая вада рыхтуецца наступным чынам: крэмень разбіць на дробныя кавалкі велічынёю арэха, 5-10 кавалкаў крэменю пакласці ў слоік і заліць вадою. Настойваецца яна пяць дзён. Так падрыхтаваную ваду трэба піць малымі глыткамі толькі ў час хваробы. Пры хваробах скуры крамянёвай вадою трэба абмываць хворыя месцы.

Побач школы-музея стаіць маленькая вясковая хатка. У ёй размяшчаецца этнаграфічны музей. Калі ўваходзіш усярэдзіну, здаецца, што гэта не музейная экспазіцыя, а сапраўдная

сялянская хата. Усе прадметы знаходзяцца на сваім прывычным месцы: на вокнах фіранкі-выцінанкі, у куце абрамлена ручніком ікона з выявай... Францыска Скарыны, развешанае адзенне на сцяне, калыска завешаная пад столлю, куфар пакрыты сурвэткай, каструлі на коміне, свежа падмецены ток — усё гэта робіць уражанне, што гаспадары выйшлі дзесьці на хвілінку.

Калі гляджу на музейны комплекс у Гудзевічах і ўяўляю ўмовы, у якіх ён ствараўся, ведаю, што мог ён узнікнуць толькі і выключна дзякуючы чалавеку-энтузіясту, якім і ёсць Алесь Белакоз. Калі ён расказваў пра стварэнне музея, пра гісторыю асобных экспанатаў, адчувалася шчырая радасць у голасе, жэстах, міміцы. Энтузіязм і любоў да роднага памагалі яму змагацца з перашкодамі, якія сустракаў, здзяйсняючы сваю жыццёвую ідэю. Алесь Белакоз заўсёды адстойваў беларускасць і неаднойчы на настаўніцкіх канферэнцыях папракаў раённых і абласных чыноўнікаў у абыякавасці да беларускай мовы, русіфікатарстве. Вядома, з-за гэтага ў чыноўнікаў не мае ён добрай маркі, а нават абвінавачваўся ў нацыяналізме. Былі пагрозы і ўмешванні з боку тагачасных мясцовых ідэолагаў, як, напрыклад, патрабаванне не экспанаваць постаці Ларысы Геніюш і яе творчасці.

Усім, хто апынецца на Гродзеншчыне, горача прапаную наведаць музей у Гудзевічах, пазнаёміцца з яго заснавальнікам.

„Ніва" н-р 14 (1769) ад 8 красавіка 1990 г.

МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС БЕЛАРУСІСТАЎ

Ідэя стварыць міжнародную арганізацыю беларусістаў узнікла ў чэрвені 1990 года ў Варшаве на канферэнцыі, прысвечанай 500-годдзю з дня нараджэння Францішка Скарыны. Тады 53 вучоныя, спецыялісты ў галіне беларускага мовазнаўства, літаратуразнаўства, гісторыі, этнаграфіі, фальклору і ма-

стацтвазнаўства прынялі дэкларацыю аб стварэнні такога згуртавання (дэкларацыю надрукавала „Ніва” ад 1.07.1990 г.), у якой прапанавалася правесці ў 1991 г. устаноўчы з’езд у Мінску. З гэтага моманту пачаліся арганізацыйныя дзеянні для ажыццяўлення гэтай ідэі. На працягу некалькіх месяцаў узніклі шэсць асацыяцый беларусістаў у розных краінах, якія вылучылі 156 дэлегатаў на ўстаноўчы кангрэс.

І вось 25 мая ў Доме літаратара ў Мінску сабраліся беларусісты ўсяго свету, каб стварыць сваю асацыяцыю, якая будзе спрыяць даследаванням па беларусістыцы, весці каардынацыю гэтых прац, абмен навуковай інфармацыяй, спрыяць падрыхтоўцы даследчыкаў-спецыялістаў. Кангрэс пачаўся з міні-канцэрта Акадэмічнай харавой капэлы, якая праспявала тры патрыятычна-рэлігійныя песні: „О, Беларусь, мая шыпшына”, „Хрыстос уваскрос” і „Магутны Божа”. Затым старшыня арганізацыйнага камітэта Адам Мальдзіс афіцыйна адкрыў кангрэс і даў інфармацыю аб ходзе падрыхтоўкі да „першага ад часоў Скарыны беларускага згуртавання”. Пленарнае пасяджэнне пачалося з прывітанняў афіцыйных асоб. Са словам да сяброў Беларусі звярнуўся намеснік старшыні Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч, які сказаў, што „не ведаў, што па-за межамі Беларусі паважаюць знявечаную на Радзіме мову і забруджаную культуру”. У далейшым выступілі: прэзідэнт АН БССР Уладзімір Платонаў, народны пісьменнік БССР Васіль Быкаў, міністр замежных спраў Пётр Краўчанка. Прывітанні ад Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына” перадаў Яўген Лецка, а ад Беларускага ПЭН-цэнтра — Рыгор Барадулін.

Мерытарычную частку кангрэса пачаў старшыня Англа-беларускага таварыства Джэймс Дынглі дакладам „Замежны погляд на сучасную беларусістыку”, у якім звярнуў увагу на тое, што з мінулым у гісторыі культуры трэба разабрацца, а не замоўчваць невыгодныя па палітычных прычынах факты. Аб стане нацыянальнай свядомасці, кандыцыі беларускага народа гаварыў пісьменнік Ніл Гілевіч, а даклад аб сучаснай польскай беларусістыцы зачытаў загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта дац. Аляксандр Баршчэўскі. Каб не надакучыць чытачам пералікам дакладчыкаў, успомню толькі,

што на пленарным пасяджэнні, якое цягнулася да абеду, выступілі вучоныя з Расіі, Украіны, Беларусі, ЗША, Швейцарыі і Балгарыі. На гэтым жа пасяджэнні прывіталі ўдзельнікаў кангрэса прадстаўнікі духавенства: пасланнік мітрапаліта Філарэта а. Георгій Латушка і каталіцкі святар а. Ян Матусевіч.

Далей праца вялася ў трох секцыях: гісторыя і культура, мовазнаўства, літаратура, мастацкі пераклад і фальклор. Я прымаў удзел у працы секцыі па мовазнаўстве і прадставіў паведамленне „Мовазнаўчыя праблемы на старонках „Нівы" і выданняў БГКТ". На працягу двух дзён на пасяджэнні гэтай секцыі выступілі 34 даследчыкі, якія парушалі справы, дагэтуль нераспрацаваныя ў беларускім мовазнаўстве. Маю ўвагу прыцягнулі пытанні беларускай мовы на Літве, у пэўным сэнсе падобныя на нашыя праблемы. Валерыюс Чэкмонас з Віленскага універсітэта гаварыў, што ў свядомасці насельніцтва беларускай мовы на Літве няма, ёсць толькі простая мова, а беларускамоўнае насельніцтва мае польскую нацыянальную свядомасць. Мікалай Савіч з Інстытута літоўскай мовы Акадэміі навук Літвы ў сваім выступленні звярнуў увагу на тое, што мясцовыя беларускамоўныя жыхары з прычыны каталіцкага веравызнання запісаны палякамі. У штодзённым жыцці карыстаюцца яны „простай" мовай. Для іх польская мова — гэта мова школы і касцёла, мова рэпрэзентатыўная, на якой размаўляецца з чужымі. Амаль на ўсёй тэрыторыі, імі населенай, ужываецца беларуская мова, толькі ў былых засценках і фальварках стараюцца гаварыць па-польску. Ніхто на вёсках не хоча вывучаць беларускую мову, але калі хто пачынае размаўляць з суседам па-польску, тады яго асадзяць такімі словамі: „ну і паляк знайшоўся", „шляхта". Часта яны аб сабе гавораць „асобная адмяна". Такую „адмяну" і ў нас на Беласточчыне нярэдка сустрэць можна.

З новай ініцыятывай выступіла праф. Альжбета Смулкова з Варшаўскага універсітэта, якая запрапанавала пачаць супольнае комплекснае даследаванне моўнага пагранічча. Прапанова была прыхільна прынята прысутнымі на кангрэсе мовазнаўцамі.

Ахарактарызаваць усе даклады ў адной справаздачы немаг-

чыма, дык з хранікёрскага абавязку пералічу толькі ўдзельнікаў мовазнаўчай секцыі з Польшчы. Былі гэта: праф. Альберт Барташэвіч, д-р Станіслаў Шадыка, д-р Надзея Панасюк, праф. Мечыслаў Басай (усе з Варшавы), праф. Тадэвуш Левашкевіч з Познані, праф. Ян Насовіч з Беластока, праф. Веслаў Віткоўскі з Кракава і дац. Васіль Ціханюк з Зялёнай Гуры.

У секцыі па гісторыі і культуры займаліся: д-р Юры Туронак з Варшавы, праф. Андрэй Садоўскі і д-р Антон Мірановіч з Беластока, д-р Мікола Іваноў з Вроцлава, праф. Марцэлі Косман з Познані, праф. Здзіслаў Нядзеля з Кракава і д-р Рышард Радзік з Любліна, а ў секцыі па літаратуры, мастацкім перакладзе і фальклоры: дац. Аляксандр Баршчэўскі, д-р Марыя Чурак і Чэслаў Сэнюх з Варшавы, дац. Ян Чыквін з Беластока, д-р Валенты Пілат і д-р Мечыслаў Яцкевіч з Ольштына.

26 мая, другі дзень кангрэса, прайшоў пад знакам арганізацыйных спраў. 119 дэлегатаў, якія прыехалі на кангрэс, мелі прыняць статут Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і выбраць кіраўнічыя органы. Кожнае галасаванне праводзілася з улікам прынцыпаў дэмакратыі і аб адабрэнні без галасавання ці яўных выбарах дэлегаты, асабліва савецкія, і слухаць не хацелі. А дэмакратыя, вядома, патрабуе часу. Некалькі гадзін паглынула прыняцце статута МАБ: чытаўся кожны яго артыкул, потым была дыскусія над ім і тады галасаванне. Затым выбіраліся кіраўнічыя органы Асацыяцыі. Перад абедам паспелі толькі вылучыць кандыдатаў у Міжнародны камітэт. Галасаванне адбылося на наступны дзень.

Другую палову дня запоўніла культурная праграма. Спачатку госці кангрэса прынялі ўдзел у свяце Беларускага пісьменства ля помніка Максіму Багдановічу, 100-ую гадавіну з дня нараджэння якога адзначаем сёлета. Урачыстасць адкрыў міністр культуры Яўген Вайтовіч. Выступілі фальклорныя калектывы, акцёры чыталі вершы паэта. З кароткай прамовай выступіў Алесь Барскі, а Вэра Рыч прадэкламавала па-англійску верш „Пагоня". Потым была паездка ў Мікалаеўшчыну на радзіму Якуба Коласа.

У апошні дзень кангрэса (27 мая) перад заключным пленарным пасяджэннем адбыўся „круглы стол", прысвечаны бе-

ларускай дыяспары, але аб гэтым будзе ў „Ніве” асобная публікацыя. На апошнім пленуме былі аб’яўлены вынікі ранішняга галасавання. З польскага боку было прапанавана пяць кандыдатаў на два месцы, якія былі прызначаны Польскаму беларусазнаўчаму таварыству. У выніку тайнага галасавання ў Міжародны камітэт увайшлі Аляксандр Баршчэўскі і Міхал Кандрацюк. Нававыбраны камітэт на закрытым пасяджэнні прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў выбраў Адама Мальдзіса, а віцэ-прэзідэнтамі Томаса Бэрда (ЗША), Джэймса Дынглі (Вялікабрытанія), Міхала Кандрацюка (Польшча) і Рыгора Піўтарака (Украіна). Вучоным сакратаром стаў Генадзь Цыхун, скарбнікам — Андрэй Каляда, а старшынёй рэвізійнай камісіі — Аляксандр Крывіцкі.

На заканчэнне былі прызнаны дыпломы ганаровага члена МАБ непрысутным на кангрэсе нестарам польскай беларусістыкі: праф. Антаніне Абрэмбскай-Яблонскай і праф. Лешку Асоўскаму, а таксама іншым замежным вучоным.

Пасля кангрэса, 28 мая, у Вярхоўным Савеце БССР адбылася ўрачыстасць уручэння медалёў імя Францішка Скарыны замежным беларусістам. Як першаму замежнаму вучонаму старшыня ВС Мікалай Дземянцей уручыў медаль Аляксандру Баршчэўскаму. Медалі прызнаны таксама Вацлаву Жыдліцкаму і Джэймсу Дынглі.

„Ніва” н-р 25 (1832) ад 25 чэрвеня 1991 г.

ПАЧЫНАЕЦЦА ЧАС ВЯРТАННЯ

Толькі што выйшла з друку кніга „Вяртанне да сваіх”, у якой сабраны паэтычныя і празаічныя творы трох заходнебеларускіх палітычных, грамадскіх і культурных дзеячаў, а заадно і літаратараў, ураджэнцаў Беласточчыны — Станіслава Грынкевіча, Франука Грышкевіча і Уладыслава Казлоўшчыка. З укладальнікам кнігі Сяргеем Чыгрыном гутарыць Віталь Луба.

— Вы вядомы ў нас як аўтар артыкулаў па гісторыі заходнебеларускай літаратуры, якія друкаваліся на старонках „Нівы". Што схіліла Вас заняцца якраз гэтым перыядам?

— Заходнебеларускай літаратурай я пачаў цікавіцца на пачатку 80-х гадоў. Гэтую цікавасць мне прывілі наш слонімскі паэт Анатоль Іверс і пакойны Уладзімір Калеснік — тады адзіны ў Беларусі спецыяліст па заходнебеларускай літаратуры, а таксама Адам Мальдзіс, Арсень Ліс, Янка Саламевіч, Алег Лойка, Вячаслаў Рагойша. На сённяшні дзень у нас амаль няма сур'ёзных даследчыкаў літаратуры Заходняй Беларусі. У Арсеня Ліса апошнім часам з'яўляецца зусім мала артыкулаў. Раней ён больш пісаў. Таму мне, тым больш заходніку, гэта цікава і гэтым захапіўся. Лічу, што літаратура Заходняй Беларусі ў нас зусім не даследавана яшчэ, а тое, што зроблена, зроблена аднабакова. Яна даволі багатая, у ёй вельмі шмат пісьменнікаў, творчасць якіх амаль невядомая не толькі замежнаму чытачу, але і беларускаму наогул.

— А як узнікла задума заняцца ўраджэнцамі Беласточчыны — Грынкевічам, Грышкевічам, Казлоўшчыкам?

— У маім хатнім архіве шмат заходнебеларускіх выданняў, напрыклад, „Калоссе", „Літаратурная старонка", калектыўныя і асобныя паэтычныя зборнікі. Гартаючы гэтыя выданні, сустракаючыся з прозвішчамі, я думаў: чаму гэта столькі было многа паэтаў, празаікаў, публіцыстаў у Заходняй Беларусі, а мы іх не вывучалі ні ў школе, ні ва універсітэце. І калі я капнуў глыбей, узварухнуў глыбу заходнебеларускай літаратуры, тады даведаўся, што гэта былі нацыянальныя дзеячы, палітыкі, вучоныя, якія шмат пісалі і думалі па-беларуску. Адны былі праваслаўныя, другія католікі. Але ўсе яны былі шчырыя беларусы і моцна любілі сваю Бацькаўшчыну. Пошукі пачаліся ў першую чаргу з апытвання былых заходнікаў, сведкаў таго часу. Яны расказвалі пра паэтаў, называлі часопісы, у якіх друкаваліся. Пачаў я шукаць тыя выданні, складаць бібліяграфію. З'явіліся новыя адкрыцці, новыя прозвішчы паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, гісторыкаў. Так патрапілася, што Франук Грыш-

кевіч, Станіслаў Грынкевіч і Уладыслаў Казлоўшчык аказаліся ўраджэнцамі Беласточчыны, а дакладней кажучы, Сакольшчыны. Трое землякоў ды такіх таленавітых! Я нават прагледзеў „Ніву" за апошніх дваццаць гадоў, але гэтых прозвішчаў не знаходзіў. Вельмі цікава пісалі пра заходнебеларускі перыяд Аляксандра Бергман, Пятро Ластаўка, Уладзімір Калеснік, але гэтыя прозвішчы чамусьці не ўспаміналіся. І толькі калі былі знойдзены матэрыялы, прысвечаныя беларускім пісьменнікам г.зв. калабарацыяністам, значыць тым, якія жылі і працавалі ў час акупацыі на тэрыторыі Беларусі, убачыў там прозвішча Уладыслава Казлоўшчыка. Ён лічыўся ворагам беларускага народа, але які ж ён вораг: што жыў на тэрыторыі акупіраванай немцамі Беларусі, што выдаваў беларускую „Менскую газэту", што выступаў з артыкуламі. Але ж ягоныя артыкулы вельмі цікавыя, і ён там нічога супраць беларускага народа не пісаў. Ён выступаў толькі супраць бальшавізму, і за тое яго палічылі ворагам. Акрамя гэтага я маю дома добры архіў беларускай эміграцыі. Дзякуючы гэтым выданням даведаўся пра замоўчваных пісьменнікаў і паэтаў. Там, на эміграцыі, і ў ЗША, і ў Канадзе, і ў Нямеччыне шмат пра іх пісалі, асабліва ў каталіцкіх беларускіх выданнях. Там ацэньваліся яны станоўча, успаміналіся добрым словам. Вядома, адкрыць новыя прозвішчы вельмі цяжка, але заадно вельмі цікава і неабходна. Проста хочацца, каб яны не згубіліся ў гісторыі беларускай літаратуры.

— У прадмове да кніжкі пішаце, што наступіў час вяртання замоўчваных пісьменнікаў у літаратуру. А якое іх месца ў агульнабеларускай літаратуры?

— Я лічу, што творчасць Грынкевіча, Грышкевіча і Казлоўшчыка — гэта не асабліва высокая літаратура. Але іх прозвішчы выкінуць з літаратуры нельга. Гэта наша гісторыя, гісторыя літаратуры Беларусі. Заходнікі варыліся ў сваім саку, былі адрэзаны ад усходняй Беларусі. Да іх бліжэй была польская, заходняя культура. Шмат у іх паэзіі паланізмаў, дыялектнай тэрміналогіі, але ёсць творы вельмі цікавыя. Напрыклад, верш-гімн „Песьня беларускай моладзі" Уладыслава Казлоўшчыка тадышняя моладзь ведала на памяць. Нават цяпер,

калі размаўляю са старэйшымі людзьмі, яны паўтараюць: „Вы ўсё яшчэ зробіце, вы «бойкая моладзь — арлы маладыя». Не памятаю, хто гэта напісаў, але гэта быў наш гімн, мы яго некалі спявалі". Чалавек, які напісаў гімн, нешта значыць. А Станіслаў Грынкевіч быў доктарам, даследаваў медыцыну на беларускай мове. Сёння ў Беларусі няма медыцынскіх выданняў па-беларуску, а тады былі. Можна выдаць велізарнейшую кнігу медыцынскіх прац Станіслава Грынкевіча, якія друкаваліся ў заходнебеларускіх выданнях. Уладыслаў Казлоўшчык выдаў па-беларуску шмат кніг прысвечаных спорту. Усе яго працы 1920-30-х гадоў па спорце просяцца пад адну вокладку. А паэзія сама па сабе. Напрыклад, Франук Грышкевіч — святлейшы лірык, падобны ў нечым на Хведара Ільяшэвіча і ранняга Максіма Танка. Час яшчэ да іх вернецца. Таму і кнігу я гэтак назваў: „Вяртанне да сваіх". Іх творчасць раскінута па ўсіх заходнебеларускіх і эміграцыйных выданнях, шмат іх твораў знаходзіцца ў архівах і бібліятэках Польшчы, Чэхіі, Літвы, Латвіі, Беларусі. Усё гэта трэба адшукваць і выдаваць.

— Ці Вы самі думаеце працягваць справу вяртання беларускай літаратуры іншых забытых творцаў?

— Яшчэ раз нагадаю: пачынаецца пара вяртання. Я хачу, напрыклад, дачакацца асобных кніжак твораў Франука Грышкевіча, Станіслава Грынкевіча, Міколы і Хведара Ільяшэвічаў, Уладыслава Казлоўшчыка, Яўгена Бартуля, Сяргея Хмары, Мікалая Шкялёнка, Адама Станкевіча і шмат іншых. Напрыклад, Сяргей Хмара — цудоўны паэт і публіцыст, таксама заходнік, які ў 1939 г. выдаў кніжачку „Жураўліным шляхам". У „Ніве" я пісаў пра Тодара Лебяду — драматурга, вялікага яркага паэта, нацыянальна свядомага аўтара. У мяне задумак вельмі шмат.

— А як дайшло да таго, што выдаваць кніжку прыехалі Вы ў Беласток?

— Гадоў чатыры назад я зрабіў машынапісы трох асобных кніжак з творамі Грышкевіча, Грынкевіча і Казлоўшчыка ды дамовіўся са старшынёю Літаб'яднання „Белавежа" Янам Чыквіным наконт іх выдання. Пераслаў яму машынапісы. Пасля

атрымаў ліст, што выдаць усе тры кніжкі ён не зможа, але можа выдаць трох аўтараў пад адной вокладкай са сваімі рэдакцыйнымі заўвагамі і змяненнямі. Я пагадзіўся, але „Белавежа", на жаль, кнігі не выдала. Бываючы на Беласточчыне, чытаючы ўсе выданні, якія тут выходзяць, заўважыў, што ў адным з навуковых выданняў ёсць спасылкі на мой машынапіс, які захоўваўся ў Яна Чыквіна. Гэта мяне з аднаго боку пакрыўдзіла, але з другога ўзрадавала, таму што адчуў, што кніжка неабходная. У Беларусі яе выдаць сёння немагчыма, бо на гэта спатрэбіліся б вельмі вялікія грошы. І толькі дзякуючы Беларускаму саюзу ў РП кніга гэта на працягу года пабачыла свет.

— *Дзякую за размову.*

„Ніва" н-р 41 (2265) ад 10 кастрычніка 1999 г.

ФОРУМ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ

5-6 ліпеня 2001 г. у Мінску адбыўся III З'езд беларусаў свету, арганізаваны Міжнародным грамадскім аб'яднаннем „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»". Рыхтаваўся ён, у адрозненні ад папярэдніх з'ездаў, без дапамогі ўлад. Амаль да апошніх дзён з-за непаслядоўнасці сталічных улад невядомым было месца яго правядзення. Толькі 29 чэрвеня вечарам канчаткова высветлілася, што з'езд адбудзецца ў зале Дома літаратараў. А месяц раней на старонках „Голасу Радзімы" намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі Іван Яновіч будучы з'езд назваў „статутным справаздачным мерапрыемствам гэтай грамадскай арганізацыі", якое „можа пераўтварыцца ў палітычнае шоу". Адзначыў ён яшчэ, што „рыхтуемы з'езд (...) выглядае як палітычная акцыя апазіцыйнага да ўладаў Беларусі характару", і арганізацыям, якія пашлюць дэлегатаў на з'езд „Бацькаўшчыны" рэкамендаваў „улічваць гэтыя абставіны".

Насуперак намаганням афіцыйных чыннікаў, якія прапанавалі перанесці з'езд на канец або на пачатак наступнага

года, III З'езд беларусаў свету ўсё ж такі адбыўся. Удзельнічалі ў ім 224 дэлегаты з краін СНД, Прыбалтыкі, Заходняй Еўропы і ЗША. З Польшчы ў працах з'езда ўдзельнічалі дваццаць два дэлегаты. Беларускае грамадска-культурнае таварыства, улічыўшы афіцыйную пазіцыю ўрада, сваіх прадстаўнікоў не паслала. У ліку 149 гасцей з'езда былі, між іншым, пасол ЗША Майкл Козак, віцэ-міністр культуры Валерый Гедройц і згаданы ўжо Іван Яновіч.

У дакладах, якія былі зачытаны ў першы дзень з'езда, выказвалася занепакоенасць станам нацыянальнай свядомасці беларусаў, становішчам беларускай мовы і культуры. Балючай справай з'яўляецца таксама дэмаграфічнае становішча Рэспублікі Беларусь, якая на пачатку III тысячагоддзя апынулася на парозе духоўнага і фізічнага знішчэння. Некалькі гадоў запар на Беларусі смяротнасць перавышае нараджальнасць і ўпершыню за многія гады колькасць насельніцтва ў краіне налічвае менш за 10 мільёнаў. Вялікую трывогу выклікае таксама стагнацыя ў эканоміцы, паслядоўнасці чарнобыльскай катастрофы і нарастаючыя працэсы эміграцыі.

У дыскусіі моцна падкрэслівалася важнасць гістарычнай айчыны, яе духовага і эканамічнага стану для дыяспары. Старшыня Беларускага саюза ў Польшчы Яўген Вапа адзначыў, што без вялікай, моцнай духовай бацькаўшчыны нацыянальныя меншасці хутчэй асімілююцца, а без веры ў яе магутнасць становяцца слабейшымі. Але кіраўніцтва сённяшняй Беларусі, на што ўказвалі чарговыя прамоўцы, вядзе антынацыянальную палітыку, доказам чаму з'яўляецца нераўнапраўнае становішча мовы тытульнай нацыі і яе культуры, а таксама палітычны курс на аб'яднанне Беларусі з Расіяй. Для ажыццяўлення гэтай мэты прыцягваюцца беларускія суполкі ў Расіі. Выявілася гэта ў выступленнях маскоўскіх дэлегатаў Францішка Каўрыгі — старшыні Савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі „Беларусы Масквы" і Генадзя Леха — старшыні Таварыства беларускай культуры імя Францыска Скарыны. Аказваецца, што апрача 6 беларускіх суполак, якія ўзніклі ў дзевяностых гадах, апошнім часам паўсталі 42 суполкі, згуртаваныя ў фе-

дэральных аўтаноміях, якія падтрымоўваюць аб'яднанне Беларусі і Расіі. Новаствораными арганізацыямі цікавіцца беларускае пасольства ў Маскве і аказвае ім падтрымку. Такім чынам у Расіі, як адзначыў Генадзь Лех, стварылася шчырая і няшчырая дыяспара. Частка дэлегатаў, галоўным чынам з Расіі і Украіны, пакарысталася запрашэннем урада і прыняла ўдзел у спатканні ў Савеце Міністраў.

Аб непазбежным паглыбленні расколу дыяспары ва ўмовах існуючага рэжыму сведчыць таксама пасланне прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі суайчыннікам далёкага і блізкага замежжа, зачытанае Іванам Яновічам на другі дзень з'езда (некаторыя палічылі гэта знакам непашаны). У ім аптымістычна гаварылася пра дасягненні Рэспублікі Беларусь на шляху будаўніцтва гарманічнага і сацыяльна справядлівага грамадства і пра перакананасць Лукашэнкі ў тым, што „прыспеў час падняць супрацоўніцтва нашай радзімы з беларусамі і выхадцамі з Беларусі іншых нацыянальнасцей на якасна новы ўзровень". А для гэтага напэўна паслужыць планаваны ўладамі на лістапад гэтага года Кангрэс беларусаў свету.

III З'езд прыняў праграму „Замежная беларуская супольнасць у XXI стагоддзі", дэкларацыю „Беларуская дыяспара і свет", заявы „Аб падтрымцы МГА ЗБС „Бацькаўшчына" і кансалідацыі ў беларускай дыяспары" і „Аб падтрымцы беларускай мовы" (дэлегаты звярнуліся да ўрада з патрабаваннем вярнуць беларускай мове статус адзінай афіцыйнай дзяржаўнай мовы).

З'езд адкрыўся і закончыўся гімнам — старажытнай мелодыяй з „Полацкага сшытка" ад 1640 года, апрацаванай для сімфанічнага аркестра кампазітарам Вячаславам Кузняцовым. Гімн будзе музычным сімвалам ЗБС „Бацькаўшчына". На словы да яго будзе аб'яўлены конкурс.

Насуперак меркаванням дзяржаўных чыноўнікаў, з'езд у палітычнае шоу не ператварыўся. Наадварот, быў ён, як гаварылі ўдзельнікі папярэдняга з'езда, больш канструктыўны, а прамоўцы пазбягалі палітычных тэм, як хаця б надыходзячых прэзідэнцкіх выбараў. Нягледзячы на палітычную стрыманасць апошняга форуму беларусаў свету, цяжка спадзяваць-

ца на падтрымку ўлад у выкананні прынятай праграмы, дзе многія прапановы адрасуюцца паасобным міністэрствам і дзяржаўным камітэтам. Для гэтага патрэбна палітычная воля, а такой, як паказала падрыхтоўка і ход з'езда, няма.

„Ніва" н-р 29 (2358) ад 22 ліпеня 2001 г.

KAMUNIKAT.org